В. С. КЛІМОВІЧ

# ІДЭЯ ЕЎРАПЕЙСКАГА ДОМА»: МІФ ЦІ РЭАЛЬНАСЦЬ?

XX век, да канца якога засталося менш за восем год, з'яўляецца эпахальным у гісторыі Еўропы. Складанае асэнсаванне цяжкіх выпрабаванняў дзвюх трагічных сусветных войнаў, а затым «халоднай вайны» прывялі, здаецца, еўрапейцаў да высновы, што яны ўяўляюць сабой згуртаванне кантынентальнага маштабу. Якой будзе Еўропе 2000 года — гэта залежыць, у першую чаргу, ад грамадзян на Усходзе і Захадзе, іх разважнасці, вытрымкі, адказнасці, іншымі словамі,— ад намаганняў і еўрапейскіх народаў, і іх урадаў.

Бурныя, хаця і супярэчлівыя змены на кантыненце, адкрываюць шырокія магчымасці для пераўтварэння прасторы ад Атлантыкі да Урала ў больш зручнае і надзейнае месца пражывання больш за паўмільярда еўрапейцаў. Пры тым горкі вопыт мінулага, памылкі і пралікі абедзвюх бакоў нагадваюць усім жыхарам «еўрапейскага дома», што толькі ўзаемная павага, неўмяшанне ў справы іншага, адмова ад сілавой палітыкі могуць даць нам усім новую Еўропу.

Як гавораць, усведамленне — пачатак мудрасці. Калі гэта так, то Еўрапейская суполка і кожная з уваходзячых у яе краін павінны трымаць шырока адчыненымі свае вокны і дзверы і наладжваць узаемавыгадныя сувязі з садружнасцю суверэнных дзяржаў, якія складваюцца ў межах былога СССР.

Уваходжанне Саюза ў Еўропу (пры любой яго назве і пры наяўнасці любой колькасці рэспублік) пачнецца з прызнання яго лідэрамі і грамадзянамі агульначалавечых каштоўнасцей, а таксама гатоўнасці кіравацца імі ў палітычным і грамадскім жыцці.

Калі паспрабаваць разгледзець гісторыю кантынента, мы прызнаем факт дзівоснага, плённага ўзаемаўзбагачэння еўрапейскіх народаў, выявім шмат павучальнага. Так, пясняр славянскай душы паляк Шапэн — французскага паходжання па бацьку; вялікі рускім пісьменнік Дастаеўскі мае беларуска-польскія карані, а тыповы нямецкі мастак Дзюрэр — вянгерскія; вялікі пясняр Венгрыі — Ліст — паходзіць з немцаў; нацыянальны венгерскі паэт Пяцёфі быў сербам. Аўтар буйнай польскай нацыянальнай эпапеі «Пан Тадэвуш» Міцкевіч быў з літоўцаў, а бацькі Бетховена, які выразна паказаў трывогі і радасці нямецкай душы, былі фламандцамі. Наша гісторыя, такім чынам, складаецца не з нянавісці і расколаў, а хутчэй з сувязей і дыялогу. Наша самасвядомасць трымаецца на творчасці тых, хто пакінуў нам скарбы культуры і складае агульны гонар. І гэта — наша багацце, сапраўдны веліч і шчырае ўкладанне ва ўсеагульную культуру. Таму, калі мы хочам будаваць агульны дом, трэба прыняць нашу спадчыну з усімі яе культурнымі адрозненнямі, асэнсоўваючы агульнасць каранёў.

Агульнаеўрапейскае будаўніцтва немагчыма без стварэння трывалага эканамічнага падмурка. Першыя крокі зроблены, але тым не менш эканамічнае супрацоўніцтва паміж дзвюма часткамі Ейропы знаходзіцца на вельмі нізкай адзнацы. Шматлікія цяжкасці тут можна пераадолець, калі не забывацца, што Еўропу будучага мы жадаем стварыць дзеля дабра чалавека, у імя чалавека, яго палітычнай і духоўнай свабоды.

Якую ж стратэгію трэба выбраць Беларусі ў адносінах да гэтага рэгіёна, што хутка змяняецца і перажывае бурны палітычны рост? Перш за ўсё наша рэспубліка не можа дазволіць сабе адстаць ад хуткага цягніка сучаснай цывілізацыі. Мы па духу, можна сказаць,— «еўрапеісты». Але цэлыя дзесяцігоддзі не па добрай волі беларусы жылі ў нейкай меры павярнуўшыся спіной да Еўропы, адгарадзіўшыся ад яе ідэалагічнымі шорамі. Зараз, калі ўсё мяняецца на вачах, калі мы сталі суверэннай дзяржавай, наш шлях — да еўрапейскай інтэграцыі.

Тапаграфічнае месца Беларусі ў Еўропе вызначаецца мерыдыянамі і паралелямі, якія адвёў рэспубліцы лёс. І ўсё ж такі мы ў аднолькавай ступені і Усход Еўропы, і Захад СНД. Рэспубліка наша размяшчаецца ў рэгіёне, праз які пралягаюць найважнейшыя старажытныя шляхі, па іх перасоўваюцца тавары, ідэі і асобы. Калі мы зможам разумна скарыстаць гэтыя магчымасці, то зможам пе ратварыць рэспубліку ў адзін з філіялаў еўрапейскага кантынента. І гэта не кепскі варыянт.

Грамадзяне Беларусі змогуць суіснаваць, калі яны сумеюць арганізаваць быццё, а не геаграфічнае існаванне ў Еўропе, калі яны наблізяць рэспубліку да сусветнай цывілізацыі. А гэта, акрамя ўсяго іншага, азначае, што

народы і асобы, якія валодаюць вялікімі дабротамі, павінны паступіцца часткай гэтых даброт на карысць іншых народаў і грамадзян, у тым ліку і не вельмі забяспечаных грамадзян Беларусі. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС у жорсткай форме нагадала аб узаемнай залежнасці ўсіх народаў: радыёактыўныя хмары, як вядома, не ведаюць межаў.

Гуманнае пераразмеркаванне матэрыяльных даброт будзе галоўнай гарантыяй захавання грамадскага парадку, які забяспечвае асноўныя свабоды і правы асобы. А менавіта такі парадак заслугоўвае, каб яго сцвярджалі і захоўвалі. І толькі тады, калі выкананне гэтага прынцыпу будзе забяспечана ва ўсіх еўрапейскіх краінах, можна будзе з поўным заснаваннем гаварыць аб стварэнні «агульнаеўрапейскага дома».

Але так сказаць, напэўна, мала. Неабходна рупліва «адсартаваць» з еўрапейскага і саюзнага вопыту тое, што падыходзіць да беларускай спецыфікі, і вызначыць тое, што не прыгодна наогул ці можа быць рэалізавана пазней, у будучым. Патрэбны новыя, набліжаныя да нашых рэалій ідэі, ідэі смелыя і неардынарныя. У першую чаргу, неабходна прызнаць, што нават самая ўражальная ідэя «агульнаеўрапейскага дома» будзе мёртвай да таго часу, пакуль яна не напоўнена канкрэтным зместам. Менавіта таму Еўропа дастаткова халаднавата рэагуе на нашы, нават самыя цікавыя, бясспрэчна, важныя ініцыятывы.

Думаецца, суверэнная Беларусь можа садзейнічаць умацаванню суполкі еўрапейцаў. Важнай прадмовай гэтага можа быць гарантыя непарушнасці межаў у Еўропе. Рэспубліка Беларусь не мае тэрытарыяльных дамаганняў да іншых дзяржаў.

Урад рэспублікі павінен праводзіць палітыку, якая накіравана на замену ваенных саюзаў надблокавымі структурамі, што ўтвараюць зародак агульнаеўрапейскай сістэмы бяспекі. Наказам часу мы лічым распаўсюджванне паняцця бяспекі на сферу эканомікі, навакольнага асяроддзя, культуры, навукі і тэхналогіі.

Беларусь ужо зараз адмаўляецца ад валодання ядзернай, бактэрыялагічнай і хімічнай зброяй і размяшчэння яе, імкнецца да таго, каб аналагічныя мэты мела адзіная Еўропа.

Дасягнуты ўзровень дэмакратыі ў Беларусі звязаны з ажыццяўленнем правоў чалавека. Новы патрыятызм павінны выяўляць нашу прыхільнасць асноўным правам, абвешчаным Канвенцыяй аб правах чалавека.

На наш погляд, урад рэспублікі можа весці перагаворы аб распаўсюджванні сферы дзеяння ЕС на сённяшнюю суверэнную Беларусь. Асабліва важнае значэнне гэта будзе мець для нашай сельскай гаспадаркі, сацыяльных і экалагічных праграм.

Аб'яднаная Еўропа павінна спрыяць працэсам замацавання міру і ўзаемаразумення на планеце. Дапушчальным інструментам гэтага з'яўляюцца нарады пад эгідай Еўрапейскага палітычнага супрацоўніцтва. Беларусь павінна хадайнічаць аб прадстаўленні ёй права ўдзельнічаць у гэтых пасяджэннях. Доўгатэрміновай мэтай Беларусі павінна стаць імкненне да стварэння справядлівага эканамічнага парадку, які адкрывае перад усімі народамі светлыя эканамічныя перспектывы.

Галоўным базавым момантам для далейшага канструявання «агульнаеўрапейскага дома» з'яўляецца, вядома, дакладнае разуменне таго, у чым еўрапейскія краіны маюць патрэбу ў першую чаргу, у чым можа выяўляцца іх зацікаўленасць у такім «доме», што іх аб'ядноўвае. На гэтае пытанне адназначна адказаць цяжка ўжо таму, што інтарэсы еўрапейскіх краін вельмі разнастайныя. Таму, мусіць, працэс агульнаеўрапейскага будаўніцтва зойме шмат часу. Чым больш разнастайнай будзе гама палітычных, грамадскіх і рэлігійных сіл, якія ўдзельнічаюць у ім, чым глыбей укараніцца ў іх асяроддзе ідэя «агульнаеўрапейскага дома», тым эфектыўней будуць вынікі.

В. М. МАЦЕЛЬ

## АГРАРНАЯ РЭФОРМА Ў КІТАЙСКАЙ ВЁСЦЫ (1978—1988)

Паспяховае ажыццяўленне эканамічнай рэформы ў сельскай гаспадарцы дазволіла Кітайскай народнай рэспубліцы ў сціслыя тэрміны выйсці на перадавыя рубяжы па вытворчасці прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. Так, сярэднегадавая вытворчасць зерня ў краіне дасягнула амаль 400 млн. т [1], што вывела краіну на адно з першых месц у свеце па вытворчасці гэтага віду сельскагаспадарчай прадукцыі.